**К. Рубель**

# КАЛАРОНІМЫ І ЛЮКСОНІМЫ Ў ТВОРЧАСЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Творчасць Максіма Багдановіча напоўнена вобразамі, што сталі сімваламі роднага краю. Зборнік «Вянок» змяшчае шмат пейзажных вершаў з вялікай колькасцю ўжывання каларонімаў і люксонімаў.

Мы прааналізавалі вершы М. Багдановіча на падставе 4 колераў: белага, чорнага, сярэбранага, залатога. Колеракод «белы» ў традыцыйнай культуры беларусаў азначае чысціню, цнатлівасць. І. Крук сцвярджае, што белы колер таксама колер смутку, нядолі. Пры пераходзе ў іншасвет адбываецца ачышчэнне, белы колер, такім чынам, можа з'яўляцца колерам смерці. Гэта адлюстравана ў вершах М. Багдановіча «*Яна збялела ўся. Ёй можа ўжо не жыць*»; «*Белы крыж, пліта, пад ёй – магіла*». Сімволіка белага колеру ў вершах М. Багдановіча адлюстроўвае блізкасць да смерці, сімвал гора, адмоўных пачуццяў чалавека.

Каларонім «чорны» таксама мае адмоўную канатацыю: «*Рыцар пад'ехаў тады бліжэй на чорным кані. Спрыгнуў з яго і рукою рану знайшоў у мяне*»; «*Толькі чорная нядоля*». У вершах «Вянка» ўжываецца вялікая колькасць адпаведных гэтаму колеру люксонімаў. Эпітэт «цёмны» не заўсёды нясе ў сабе адмоўнае значэнне, часта змяшчае таксама семантыку таямнічасці прыроды: «*Сон цёмны ўсе мацнее, мне дзьме жыцця рушэнне*»; «*Узор прыгожых пекных зор Гарыць у цемні небасхіла*»; «*На цёмнай гладзі сонных луж балота*».

Улюбёным часам сутак паэта быў вечар, што ўвасабляў не схілак дня, пару згасання сонца, а сцішанасць гукаў, зіхаценне фарбаў, засяроджанасць сутнаснага жыцця. Для апісання ночы аўтар выкарыстоўвае залатыя і сярэбраныя фарбы. Жоўты колер у творах амаль адсутнічае, выкарыстоўваюцца пераважна яго адценні: «*Не бачыш, што глядзіцца сонца Ў люстэрка – месяц залаты?*» Выкарыстоўваючы металічныя фарбы, аўтар перадае казачнасць, незвычайнасць ночы: «*І праз імглу яго патроху праступае Маленькіх зор дрыжачы, срэбны пыл*». У адрозненні ад залатога, сярэбраны колер не заўсёды ўжываецца ў пазітыўным ракурсе: «*Ў лахмане зрэбным і нячыстым Са срэбрам ззяючым маністым. І, чуючы твае адмовы, Шыпіць пракляцця злыя словы*». Гэта можна тлумачыць цеснай сувяззю сярэбранага колеру з шэрым, які ў сваю чаргу сімвалізуе страту радасці, абыякавасць.

Праз вялікую колькасць няяркіх фарбаў, схільнасць да фантасмагарычнасці ў вершах М. Багдановіча мы праводзім паралель з яго ўласным жыццём, трагічным лёсам паэта збалелай душы, якая апошнімі сіламі імкнулася спасцігнуць таямніцы жыцця.

Такім чынам, можна падвесці вынік, што каларонімы і люксонімы ў мастацтве выкарыстоўваюцца не толькі для стварэння ёмістых вобразаў, але і прадугледжваюць адпаведную семантыку, што адлюстроўвае адметнасць успрымання колераў аўтарам, яго светапогляд, псіхалагічны стан ў пэўны перыяд жыцця.